Шелкопляс. – Минск: Тессей, 2004. – 318 с.
7. Маргунский, С.П. Создание и упрочение белорусской государственности / С.П. Маргунский. – Минск: Изд-во АН БССР, 1958. – 258 с.
8. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1993 – 2001.
9. Юхо, Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: у 2 ч. Ч. 2 / Я.А. Юхо. – Мінск: РІВШ БДУ, 2003. – 275 с.

**Гужалоўскі Аляксандр Аляксандравіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

## АНТЫРЭЛІГІЙНАЯ КАМПАНІЯ 1929–1930-х гг. У БССР

Пачатак антырэлігійнай кампаніі, распачатай Сталіным у другой палове 1927 г. і падрыхтаваўшай новую хвалю антырэлігійнага наступу ў 1929 г., амаль не адбіўся на змесце і маштабах работы па барацьбе з рэлігіяй у Савецкай Беларусі. Адыход ад «рэлігійнага НЭПа» адбываўся ў шматканфесійнай рэспубліцы павольна і непаслядоўна. У прынятай 17 ліпеня 1928 г. сакратарыятам ЦК КП(б)Б рэзалюцыі «Аб становішчы і задачах антырэлігійнай работы ў БССР» канстатавалася паслабленне антырэлігійнай работы ў шэрагу акруг, у т. л. у Мінскай і Віцебскай. Сярод нацыянальных меншасцей і сектантаў яна наогул не праводзілася. Беларускі саюз бязбожнікаў вёў вартае жалю існаванне, налічваючы ў сваіх шэрагах менш за 8 тыс. чалавек, пераважна служачых і вучняў. Актыў бязбожнікаў ня быў узяты на ўлік і з ім не праводзілася ніякай працы [18, арк. 15–16].

Нягледзячы на тое, што ў распарадчай частцы гэтага дакумента пералічваліся захады па пастаноўцы шырокай антырэлігійнай працы, пералому ў ёй ў другой палове 1928 г. дасягнута не было. Калі ў канцы студзеня 1929 г. у Мінску адбылося абмеркаванне цыркулярнага ліста ЦК УсеКП(б) «Аб мерах па ўзмацненню антырэлігійнай работы», беларускае партыйнае кіраўніцтва прызнала, што яго дзейнасць у дадзеным пытанні не адпавядала ўзроўню патрабаванняў, што прад’яўляліся вышэйшым партыйным кіраўніцтвам. Напрыклад, у той час толькі 6% грамадзянскіх абрадаў, якія здзяйсняліся ў рэспубліцы не пацвярджаліся рэлігійнымі дзеяннямі. У паловы камуністаў, працаваўшых на прадпрыемствах і ўстановах ВСНГ БССР меліся дома абразы [27, с. 73–82].

Сітуацыя змянілася ўжо ў наступным месяцы, пасля таго, як першы сакратар ЦК КП(б)Б Я. Б. Гамарнік у палітычным дакладзе XII з’езду КП(б)Б прысвяціў пытанню антырэлігійнай прапаганды асобную частку. У ім утрымлівалася шмат крытыкі на адрас адказных за атэістычнае выхаванне («я, напрыклад, не мог атрымаць даведкі, колькі па Беларусі чальцоў «Бязбожніка»), а таксама агрэсіўных выказванняў у адрас служыцеляў культу і вернікаў («царкоўнік лезе ў школу і на фабрыку, на Добрушы царкоўнікі адчуваюць сябе часам прамымі гаспадарамі, забаранялі спяваць камсамольскія песні», «царкоўнікі спрабуюць уплываць і на бядноту і на серадняка, па Мінскай акрузе ў царкоўныя рады ўваходзяць 69% сераднякоў, 17% беднякоў і 10% кулакоў». Заканчваўся раздзел заклікам Я. Б. Гамарніка пачаць супраць рэлігіі рашучы наступ, уцягваючы ў гэтую барацьбу шырокія шэрагі працоўных. Першы сакратар асабліва падкрэсліў, што «гэта класавая

барацьба і партыя павінна яе весці з усёй рашучасцю» [13, арк. 29–31]. У рэзалюцыі з'езда па справаздачы ЦК казалася: «XII з'езд лічыць неабходным і даручае ЦК зрабіць неадкладна ўсе захады да найбольш шырокага разгортвання антырэлігійнай прапаганды ў масах, падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў прапагандыстаў-антырэлігійнікаў, укаранення антырэлігійнай прапаганды ва ўсю масавую работу клубаў, хат-чытальняў, выдання масавай папулярнай антырэлігійнай літаратуры, надаючы асаблівую ўвагу пастаноўцы антырэлігійнага выхавання дзяцей у працоўнай школе» [14, арк. 500].

Пасля заканчэння з'езда ў рэспубліцы разгарнулася шырокая антырэлігійная работа. Яе падставай з'явілася пастанова ЦВК РСФСР «Аб рэлігійных аб'яднаннях» ад 8 красавіка 1929 г., якая на доўгія гады была пакладзена ў аснову дзейнасці мясцовых савецкіх органаў па кантролі за рэлігійнымі арганізацыямі. Пастанова забараняла ўсялякую царкоўную дзейнасць па-за сценамі храмаў, што разглядалася як прапаганда. Рэлігійным аб'яднанням забаранялася таксама праводзіць дзіцячыя, моладзевыя і жаночыя малітоўныя сходы. На ўсе іншыя дзеянні трэба было браць дазвол мясцовых саветаў. Нягледзячы на тое, што царква не атрымала правы юрыдычнай асобы, усе рэлігійныя аб'яднанні на працягу года павінны былі прайсці рэгістрацыю. У выпадку непраходжання, мясцовыя органы зачынялі прыход і адбіралі культавае збудаванне.

Правядзенне ў жыццё пастановы ЦВК суправаджалася магутнай прапагандысцкай кампаніяй. Тэмы, што раскрывалі шкоду рэлігіі, былі ўключаныя ў план вывучэння ў сетцы партыйнай і камсамольскай палітасветы. Не абыходзіў антырэлігійную тэматыку рэспубліканскі і мясцовы друк, асабліва напярэдадні рэлігійных свят. Тады старонкі газет і часопісаў пачыналі стракацець загалоўкамі накшталт «Каму патрэбны вялікдзень», «Класавая сутнасць каляд» і інш. Для барацьбы з царквой выкарыстоўваліся і эканамічныя метады. Святароў прымушалі падпісвацца на аблігацыі дзяржаўных пазык, здаваць грошы і каштоўнасці ў розныя фонды, іх абкладалі высокім падаходным і сельгаспадаткам, за нявыплату якога належаў арышт. 5 кастрычніка 1929 г. прэзідыум ЦВК БССР забараніў надзяляць зямлёй на агульных падставах «служыцеляў рэлігійных культаў і членаў іх сямействаў, якія жадаюць апрацоўваць зямлю ўласнымі сіламі». Акрамя таго, атрыманне служыцелямі культу ўзнагароджання за выпраўленне трэбаў магло лічыцца падставай да пазбаўлення іх права на землекарыстанне [7, с. 848].

Ударнай сілай у барацьбе з царквой стаў Саюз ваяўнічых бязбожнікаў Беларусі. Публічная крытыка, агучаная першай асобай рэспублікі паспрыяла яго структурнаму і кадраваму ўмацаванню, атрыманню дадатковага фінансавання, прыцягненню новых шараговых сябраў. Увесну 1929 г. у адпаведнасці з планам, распрацаваным Цэнтральным саветам саюза, узначаленым акадэмікам С. Ю. Матулайцісам, ва ўсіх акруговых цэнтрах прайшлі канферэнцыі. У рэгіёнах было запланавана адкрыццё антырэлігійных музеяў і выстаў, чытанне лекцый, у сталіцы – правядзенне першамайскага антырэлігійнага карнавалу [2, с. 4].

У пачатку чэрвеня 1929 г. у Мінску прайшоў першы Ўсебеларускі з'езд Саюза ваяўнічых бязбожнікаў, які, паводле афіцыйнай інфармацыі, ужо налічваў каля 40 тыс. членаў (што было вялікім перабольшаннем). Новы

дзяржаўны курс у дачыненні да рэлігіі выявіўся ў замене на пасадзе старшыні Цэнтральнага савета 62-гадовага С. Ю. Матулайціса на 33-гадовага прафсаюзнага функцыянера А. М. Платуна і ўключэнні ў яго склад маладога філосафа-марксіста акадэміка С. Я. Вольфсана. Пры Цэнтральным савеце стваралісяагітпрапсекцыя з метадычнай, лектарскай і літаратурна-выдавецкай камісіямі, антысектанцкая секцыя, а таксама секцыі па рабоце сярод моладзі, жанчын і ў вёсцы. Асаблівыя надзеі ўскладаліся на моладзь, у якой актыўна і мэтанакіравана культывавалі злосць і нецярпімасць да царквы, духавенства, вернікаў. У выступленнях удзельнікаў гаварылася пра ажыўленне антырэлігійнага руху ў БССР, як у горадзе, так і ў вёсцы, павелічэнне колькасці нізавых ячэек, стварэнне цэнтральных антырэлігійных курсаў, бязбожных калгасаў і брыгад, а таксама паспяховым правядзенні антывялікоднай кампаніі 1929 г. Ставіліся задачы выдання газеты «Бязбожнік Беларусі», арганізацыі сацспаборніцтва з Саюзам ваяўнічых бязбожнікаў Заходняй вобласці РСФСР, наладжвання ўліку рэлігійнага насельніцтва ў рэспубліцы. Асаблівую ўвагу, з улікам складаных узаемаадносін паміж СССР і Польшчай, трэба было надаваць 400 тыс. католікам, якія жылі ў БССР [19, арк. 11–32].

Саюз ваяўнічых бязбожнікаў Беларусі выбудоўваўся як згуртаваная, адмабілізаваная, структураваная арганізацыя з вертыкальнымі сувязямі. Арганізаваная на прынцыпах «дэмакратычнага цэнтралізму», з нізавымі арганізацыямі на вытворчасці, раённымі і акруговымі арганізацыямі, яна была падобная на партыю. Ваюючы з рэлігіяй, арганізацыя сама ўсё больш нагадвала экстрэмісцкую рэлігійную секту, якая не дазваляла гучаць галасам тых, хто нават сумняваўся. Саюз актыўна ўключыўся ў рэалізацыю планаў дзяржавы па масаваму закрыццю цэркваў і прыходаў.

22 кастрычніка 1929 г. Цэнтральны савет саюза разаслаў у акруговыя саветы анкету з мэтай збору звестак аб дзейнасці ячэек бязбожнікаў на месцах. Пункты анкеты дазваляюць рэканструяваць асноўныя напрамкі, па якіх ішла іх праца: 1. Закрыццё цэркваў і прапановы аб зносе розных помнікаў рэлігійных культаў; 2. Закрыццё і знос манастыроў; 3. Закрыццё і знос стараверскіх памяшканняў; 4. Закрыццё касцёлаў, кірхаў і іншых рэфарматарскіх памяшканняў; 5. Закрыццё сінагог і мячэцяў; 6. Знос або закрыццё могілак; 7. Барацьба з сектанцтвам; 8. Забарона выдаваць рэлігійную літаратуру; 9. Забарона вырабу і продажу прадметаў рэлігійнага культу; 10. Выкарыстанне званоў для патрэб прамысловасці і сельскай гаспадаркі. 11. Забарона перазвону; 12. Адмена рэлігійных свят і замена іх святамі рэвалюцыйнымі і іншымі днямі адпачынку [19, арк. 43].

У рэальнасці гэта выглядала наступным чынам. 16 сакавіка 1929 г. пасля заканчэння працоўнага дня «шматтысячны натоўп рабочых и рамеснікаў» з’явіўся да будынку Мінскага гарсавета і патрабаваў перадачы ўсіх сінагог горада пад культурніцкія патрэбы [26, с. 4]. Неўзабаве 25-тысячны мітынг рабочых, чырвонаармейцаў, студэнтаў і навучэнцаў, які адбыўся на плошчы Свабоды ў Віцебску, перадаў у горсавет рэзалюцыю з патрабаваннем закрыцця 6 цэркваў, 9 сінагог і 1 касцёла [5, с. 2]. Падобная рэзалюцыя была прынята на 2,5-тысячным мітынгу працоўных Мазыра, арганізаваным мясцовым саюзам бязбожнікаў [6, с. 1]. 31 красавіка зноў адбылася масавая антырэлігійная акцыя ў сталіцы рэспублікі. На гэты раз закрыцця касцёлаў патрабавалі католікі. Яны прайшлі з адпаведнымі

плакатамі і транспарантамі ад Чырвонага касцёла да пляца Волі [22, с. 1].

Неўзабаве бязбожнікі, апраўдваючы сваю назву, перайшлі да больш ваяўнічых дзеянняў. Па звестках АДПУ, у студзені 1930 г. яны выставілі ўзброеныя пасты ля ўваходу ў шэраг цэркваў Гомельскай акругі, куды не прапускалі святароў для правядзення калядных набажэнстваў. Адначасова па ўласнай ініцыятыве яны распачалі зняцце званоў, знішчэнне абразоў і разборку капліц. У Мінску групы піянераў і камсамольцаў ўрываліся ў прызначаныя для закрыцця цэрквы і ладзілі там антырэлігійныя прадстаўленні [16, арк. 47]. Агульны сход навучэнцаў Віцебска ўхваліў рашэнне аб зняцці званоў з храмаў горада, бо іх перазвон перашкаджаў вучобе [10, с. 3]. Антывелікодны карнавал, наладжаны ячэйкай бязбожнікаў у Пухавічах скончыўся сутыкненнем з вернікамі. Гэты канфлікт меў судовы працяг – дзяк Сырэц, які арганізаваў абарону будынка царквы атрымаў год зняволення [1, с. 4]. Група вернікаў была асуджана да розных тэрмінаў зняволення таксама ў Тураве. Яны абвінавачваліся ва ўзяцці штурмам будынка мясцовага савета з мэтай вызвалення святара П. Караля [3, с. 4].

У 1929 г. быў прысуджаны да расстрэлу настаяцель касцёла м. Блонь Пухавіцкага раёну. Пазней вышэйшая мера была замененая яму трыма гадамі лагераў. Становішча каталікоў яшчэ больш ускладнілася пасля з’яўлення 8 лютага 1930 г. адкрытага ліста папы Пія XI у абарону рэлігіі і яго закліку маліцца за ахвяраў веры ў СССР. Як рэакцыю уладаў на гэты дакумент можна разглядаць арышт у БССР 10 ксяндзоў, у т. л. адміністратара Мінскай дыяцэзіі біскупа Б. Слоскана. Апошні быў змешчаны ў турму восенню 1930 г., адразу пасля вяртання з Салаўкоў, дзе адбываў трохгадовае зняволенне [9, с. 187]. Адначасова вернікаў-каталікоў падвяргалі узмоцненай прапагандысцкай апрацоўцы. Яе яскравым узорам можа быць інтэрв’ю савецкаму друку, дадзенае 15 красавіка 1930 г. адміністратарам Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі ксяндзом Аўгло. У ім сцвярджалася, што ў СССР няма ніводнага выпадку пераследу каталіцкага духавенства, або спроб гвалтоўнага закрыцця касцёлаў [21, с 98]. З мэтай дыскрэдытацыі каталіцызму беларускія газеты змяшчалі паведамленні аб выяўленні ў касцёлах вернікамі кампраментуючых матэрыялаў накшталт брашураў «Як выкарыстоўваць прэзерватывы», «Як засцерагчыся ад цяжарнасці», парнаграфічных паштовак, любоўных лістоў ксяндзоў [11, с. 4].

У сакавіку 1930 г. кіраўніцтва АДПУ санкцыянавала арышт у Мінску 14 рабінаў, у т. л. галоўнага рабіна Беларусі М. Глускіна, якіх неўзабаве давялося выпусціць у выніку распачатага міжнароднага скандалу. Тым не менш, у наступным годзе арышты і адпраўка ў Салавецкія лагеры рабінаў працягнулася. Адначасова пад living рознымі падставамі прапагандыстскага характару – з мэтай выкарыстання ў якасці клубаў, грамадскіх чытальняў, ясляў – пачалася канфіскацыя сінагог у вернікаў. Напрыклад, у канцы студзеня 1929 г. сход працоўных мінскага заводу «Чырвоны світанак» прыняў рашэнне аб перадачы сінагогі ў раёне Ляхаўка дзіцячай установе [20, с. 2].

4 снежня 1929 г. на нарадзе камуністаў-газетных работнікаў незвычайную форму антырэлігійнай работы, якая да таго ж давала эканамічны эфект, прапанаваў наркам гандлю рэспублікі К. Ф. Бенэк. Гаворка ішла аб адабранне старых габрэйскіх богаслужбовых кніг для іх

наступнай рэалізацыі ў ЗША. «У Амерыцы маецца вельмі шмат багатых габрэяў. Калі туды прывезці які-небудзь абраз уладзімірскага багамаза, то гэта ім не цікава, але за старадаўнюю якую-небудзь габрэйскую кнігу ці іншую рэч, яны гатовыя заплаціць шмат грошай. Мы гэтай справай заняліся і вывозім гэтую дрэнь. Мы можам фактычна вельмі моцна дапамагчы Беларусі, увозіць замест яе трактары». З наступнага пасажа К. Ф. Бенэка беларускія журналісты даведаліся пра пікантныя падрабязнасці ўжо ажыццёўленых антыкварных аперацый, якія далі ўсяго 25 тыс. долараў: «Галоўліт не выпускаў ў гэтым годзе для продажу за мяжой такія кнігі, бачыце, маўляў, вялікая каштоўнасць для Музэя, але Галоўліту за гэта далі добрую лупцоўку і нам дазволілі вывезці іх». Затым прысутныя даведаліся аб скандале, які распачаўся ў ЗША з нагоды продажу кніг і начыння з закрытых сінагог. Гэты скандал вымусіў савецкіх гандлёвых прадстаўнікоў на час спыніць гандаль, а праз некаторы час аднавіць яго ўжо на нелегальнай аснове [15, арк. 40].

Жорсткі супраціў атэістычнай прапагандзе ў БССР аказвалі члены пратэстанцкіх абшчын, колькасць якіх на працягу 1920-х гг. няўхільна павялічвалася. Напрыклад, толькі за 1928 г. колькасць беларускіх пратэстантаў вырасла на 239 чалавек і перавысіла 5 тыс. Падчас кампаніі 1929–1930 гг. многія пратэстанцкія абшчыны (пераважна евангельскія хрысціяне і баптысты) перайшлі на нелегальнае становішча. Адной з іх была абшчына на мінскім шклозаводзе «Пралетар», якой кіраваў прэсвітэр Слабко. Ён звяртаўся да вернікаў з такімі пропаведзямі: «Ленін і ёсць той цмок, пра які піша сьвяты Ян», «Камуністы і бязбожнікі – гэта звяры, якія выконваюць волю дракона», «І былі дадзены Леніну вусны, якія гаварылі горда і богазьняважліва і ўся зямля ўшаноўвала цмока». Асаблівае раздражненне партыйных ідэёлагаў выклікала рэлігійная адаптацыя пратэстантамі савецкіх святаў. 8 сакавіка яны святкавалі «Дзень сястрынства», 1 мая – «Дзень сусветнага братэрства», а «Тыдзень абароны» ператварылі ў «Тыдзень кахання» [23, с. 3]. Напачатку 1929 г. АДПУ выявіла групу «шпіёнаў-баптыстаў», прышлых з ЗША з мэтай фінансавай і тэхнічнай падтрымцы беларускіх адзінаверцаў. «Шпіёны» базіраваліся ў сакратара Беларускага саюза баптыстаў Дразда [8, с. 2]. Тады ж быў асуджаны першы прэсвітар мінскай баптысцкай царквы Б. Чаберук [24, с. 3].

Антырэлігійная прапаганда часта набывала грубую, агрэсіўную, нецярпімую форму. Так, галоўная партыйная газета рэспублікі паведамляла, што вада ў святой крыніцы Грутава, побач з Дуброўна, заражана пранцамі [25, с. 4]. Чырвонаармейцы адной з частак Беларускай вайсковай акругі высоўвалі патрабаванне, каб магілёўскі гарсавет адключыў падачу электрычнасці ва ўсе рэлігійныя ўстановы, бо электраэнергіі «не хапала для асвятлення вуліц» [12, с. 3]. А будучы класік беларускай літаратуры К. Крапіва стварыў «Гімн бязбожнікаў» [4, с. 3].

Пачынаючы з вясны 1929 г. у прыёмную ўсебеларускага старасты А. Р. Чарвякова ішла плынь скаргаў аб закрыцці цэркваў, касцёлаў, сінагог, мячэцяў і малітоўных дамоў, разграбленні і знішчэнні абразоў, святых кніг, а таксама царкоўных рэчаў. Гэтыя скаргі перадаваліся на разгляд у Цэнтральную камісію па аддзяленні царквы ад дзяржавы НКУС БССР. Адказы, які атрымлівалі вернікі ад камісіі праз сакратарыят прэзідыума ЦВК БССР, былі амаль заўсёды адмоўныя [17, арк. 1–41].

Вясной 1930 г. пачалося згортванне рэпрэсій, накіраваных супраць духавенства і членаў рэлігійных суполак. Гэта было абумоўлена запаволеннем тэмпаў правядзення калектывізацыі – паралельна з скарачэннем колькасці калгасаў пачалося вяртанне храмаў вернікам. Улада пайшла і на некаторыя іншыя саступкі.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. А. Вылазка царкоўнікаў / А. // Зьвязда. – 1929. – 3 кастр. – № 226.
2. Антырэлігійныя музэі ў Беларусі // Зьвязда. – 1929. – 18 крас. – № 87.
3. Антысавецкае выступленьне клерыкалаў у Тураве // Зьвязда. – 1929. – 26 ліп. – № 168.
4. Вечар юнага ваяўнічага бязбожніка. Рэпертуар для школьных самадзейных гурткоў / Скл. Грахоўскі. – Менск: ДВБ, 1934. – 64 с.
5. Вялікая антырэлігійная дэманстрацыя рабочых // Зьвязда. – 1929. – 6 крас. – № 77.
6. Замест рассаднікаў дурману – ачагі культуры // Зьвязда. – 1929. – 2 крас. – № 73.
7. Збор законаў і загадаў Рабоча-Сялянскага Ўраду БССР. – 1929. – 9 снеж. – № 38. – Аддз. 1.
8. Зьвязда. – 1929. – 8 лют. – № 30.
9. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX ст.) / В. В. Грыгор’ева і інш. – Мн.: ВП «Экаперспектыва», 1998. – 340 с.
10. Медзь званоў у кацёл індустрыялізацыі // Зьвязда. – 1929. – 17 снеж. – № 288.
11. Менскі катадральны касьцёл – склад контррэволюцыйнай літаратуры // Чырвоная зьмена. – 1930. – 12 студз. – № 10.
12. Наказ сапёраў // Зьвязда. – 1929. – 29 студз. – № 21.
13. НАРБ. – Ф. 4п. – Воп. 1. – Спр. 4308.
14. Там жа. – Спр. 4310.
15. Там жа. – Спр. 4592.
16. Там жа. – Спр. 4721.
17. Там жа. – Ф. 6. – Воп. 1. – Спр. 2034.
18. Там жа. – Ф. 261. – Воп. 1. – Спр. 1.
19. Там жа. – Спр. 6.
20. Наш наказ – закрыць сінагогу на Ляхаўцы // Зьвязда. – 1929. – 25 студз. – № 18.
21. Папа Пій і крыжовы паход: Сб. нарысаў / Пад рэд. І. І. Шыпілы. – Мн.: БДВ, 1930. – 116 с.
22. Пралетарскі адпор клерыкалізму // Зьвязда. – 1929. – 2 крас. – № 73.
23. С. Г. Клясавы вораг – у сэктанцкай вопратцы / Г. С. // Зьвязда. – 1929. – 16 лют. – № 37.
24. Сэктанцкая абшчына – арганізацыя антысавецкіх элементаў // Зьвязда. – 1929. – 9 чэрв. – № 129.
25. Ц-н. «Сьвятая» крыніца заразы // Зьвязда. – 1929. – 2 кастр. – № 225.
26. Шматтысячная дэманстрацыя яўрэйскіх рабочых і саматужнікаў каля гарсавету // Зьвязда. – 1929. – 17 сак. – № 61.
27. Янушевич, И. И. Антирелигиозная пропаганда в БССР накануне «года великого перелома» / И. И. Янушевич // Научные труды Республиканского института высшей школы. – 2015. – № 2.